PolotskSU

Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Полоцкий государственный университет»

# Романо-германская филология. Контексты культуры и литературные связи

*Международный сборник научных статей*

**Новополоцк**
**2017**

PolotskSU

УДК 82.0(082)
ББК 83.3(4)я43

**Полоцкий государственный университет**

**Редколлегия:**
А.А. Гугнин – доктор филологических наук (отв. ред.);
Д.А. Кондаков – кандидат филологических наук;
Т.М. Гордеенок – кандидат филологических наук;
Р.В. Гуревич – доктор филологических наук;
Г.Н. Ермоленко – доктор филологических наук;
Е.А. Зачевский – доктор филологических наук;
З.И. Третьяк – кандидат филологических наук;
Н.Б. Лысова – кандидат филологических наук;
С.М. Лясович – кандидат филологических наук;
С.Ф. Мусиенко – доктор филологических наук;
М.Д. Путрова – кандидат филологических наук;
Л.Д. Синькова – доктор филологических наук;
И.А. Чарота – доктор филологических наук.

**Рецензенты**:
кандидат филологических наук, профессор,
заведующий кафедрой зарубежной литературы МГЛУ Ю.В. Стулов,
кандидат филологических наук, доцент,
заведующий кафедрой перевода БГУ Д.О. Половцев

**Романо-германская филология. Контексты культуры и литературные связи** : междунар. сб. науч. ст. / Полоцкий гос. ун-т ; редкол.: А.А. Гугнин (отв. ред.) [и др.] – Новополоцк, 2017. – 352 с.
ISBN 978-985-531-572-9.

В настоящем международном научном сборнике, продолжающем предыдущие издания (2011 и 2013 гг.) кафедры мировой литературы и иностранных языков Полоцкого государственного университета, публикуются статьи по актуальным вопросам романо-германской и славянской филологии, методологии литературоведческих исследований, методике преподавания гуманитарных дисциплин. Особое внимание в данном сборнике уделено проблемам конкретно-исторического изучения литературных взаимосвязей, а также философским, социальным и литературоведческим аспектам изучения проблемы войны и мира.

УДК 82.0(082)
ББК 83.3(4)я43

**ISBN 978-985-531-572-9**

© Полоцкий государственный университет, 2017

PolotskSU



2. Bernhard, Th. Auslöschung. Ein Zerfall / Th. Bernhard. – Frankfurt/M., 1986.
3. Павлова, Н.С. Реальность и жанр у Бернхарда // Павлова Н.С. Природа реальности в австрийской литературе. – М.: Языки славянской культуры, 2005.
4. См.: Korte, H. Dramaturgie der «Übertreibungskunst». Thomas Bernhards Roman «Auslöschung. Ein Zerfall» / H. Korte // Text + Kritik. – Heft 43. Thomas Bernhard. 3. Auflage: Neufassung. – 1991.
5. См.: Асоўскі, С. Сацыялагічны аналіз паняцця радзімы / С. Асоўскі // Спадчына. – 1995. – № 5.
6. Белобратов, А.В. Томас Бернхард: двадцать лет спустя / А.В. Белобратов // Иностранная литература [Электронный ресурс]. – 2010. – № 2. – Режим доступа: http://magazines.russ.ru/inostran/2010/2/be2.html. – Дата доступа: 10.05.2015.
7. Sorg, B. Die Zeichen des Zerfalls. Zu Thomas Bernhards «Auslöschung» und «Heldenplatz» / B. Sorg // Text + Kritik. – Heft 43. Thomas Bernhard. 3. Auflage: Neufassung. – 1991.
8. Bernhard, Th. Der Italiener / Th. Bernhard. – Salyburg, 1971.

## АДЛЮСТРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ХАРАКТАРУ Ў АНГЛІЙСКАЙ ПРОЗЕ 1940−50-Х ГАДОЎ (ГЕРОЙ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ)

**М.А. Курыпка**
*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, Мінск (Беларусь)*

Ваенны раман у англійскай літаратуры займае важнае месца. Гэты літаратурны жанр дазваляе ў поўнай меры раскрыць гераічны характар чалавека, вызначыць у яго вобразе патрабаванні часу і грамадскія ідэалы. Даследчык Р. Йорк заўважае, што вайна – гэта выпрабаванне, якое дазваляе вызначыць у героі такія якасці як смеласць, уласцівая годнасць, метанакіраванасць і здольнасць быць лідарам [1, с. 246]. Сапраўды, для літаратуры вайна цікава тым, што прапануе абставіны, падчас якіх чалавек вымушаны рызыкаваць сваім жыццём, якія патрабуюць ад яго здзяйснення нечаканых, неардынарных і адважных учынкаў.

Нацыянальны характар фарміруецца стагоддзямі пад уплывам шматлікіх фактараў, адным з якіх з’яўляюцца і войны. Як ні парадксальна, вайна можа выступать той лакмусавай паперай, з дапамогай якой можна раскрыць усю сутнасць чалавечага, а значыцца і нацыянальнага характару. Менавіта вайна дапамагае паглыбляць тыя ці іншыя чалавечыя якасці, умацоўваць адны рысы нацыянальнага характару і негатыўна ставіцца да іншых. А літаратура, якая адлюстроўвае сабою аб’ектыўную рэальнасць, «...узмацняе і робіць больш дакладным вобраз нацыянальнага характару» [2, с. 14]. Такім чынам, экстрэмальныя абставіны вайны даюць магчымасць для максімальнага праяўлення нацыянальных рыс характару, якія не так відавочны ў мірным жыцці.

Шматлікія войны, якія ведала англійская гісторыя, пакідалі свой бачны след у мастацтве. Пацверджаннем гэтага з’яўляюцца творы амаль с самага пачатку існавання літаратуры, а менавіта гераічны эпас «Беавульф». Канфлікты XIX стагоддзя далі сюжэты Байрану і Тэкерэю, Крымская вайна паўстае перад намі ў баладах Тэнісана і пакідае свой адбітак на творчасці Ч. Дыкенса, Р. Кіплінг даў нам магчымасць убачыць ваенныя супрацьстаянні ў Індыі і Паўднёвай Афрыцы. Справядліва сказать і тое, што Першая і Другая сусветныя войны, скалыхнуўшыя ўсю планету, застаюцца жыць у літаратуры, захаваныя сучаснікамі ці нашчадкамі гэтых падзей.

Не сакрэт, што цяжка сказаць дакладна, калі ў літаратуры адбываюцца змены погляду на праблему. Вызначыць дакладна, калі скончыўся адзін этап і распачаўся другі, звычайна цяжка. Выразнай мяжы няма [3, с. 3]. Але XIX стагоддзе можа лічыцца той мяжой, калі пачаліся сапраўдныя пошукі разумення гераічнага, калі літаратура пачала знаходзіць новага героя, не адарванага ад грамадства, блізкага да людзей і рэальнага жыцця. Сапраўды, як сцвярджае В. Панкоў, гераізм патрабуе ад мастацтва не простага апісання незвычайных фактаў і біяграфій, а пазнання – пазнання таго, як гераізм нараджаецца і развіваецца, змяняе чалавечыя характары, узбагачвае унутранае жыццё, псіхалогію асобы [4, с. 36]. А. Коршунава справядліва заўважае, што «рысы англійскага нацыянальнага характару трапілі ў сферу мастацкага асэнсавання ў віктарыянскую эпоху, што было звязана як з узмацненнем рэалізму ў літаратуры, так і з тэндэнцыямі рэальнага праяўлення дамінантных рыс англійскага характару ў гістарычных абставінах» [2, с. 15]. Выключнае значэнне для асэнсавання гераічнасці чалавека ў канцы XIX стагоддзя мела творчасць Рэд’ярда Кіплінга.

Да Другой сусветнай вайны англійская літаратура падышла з вялікім мастацкім багажом ваеннай гераічнай літаратуры. Між тым агульная карціна мастацкага жыцця краіны была больш чым песімістычная. Вельмі трапна апісаў свае адчуванні ў гэты перыяд Джордж Оруэлл «у той час, як я пішу, вельмі цывілізаваныя людзі лётаюць над маёй галавой і спрабуюць мяне забіць» [5, с. 100]. Сапраўды, Брытанія ўпершыню сутыкнулася з вайной, якая была не падобная да іншых войн. Гэта ўжо былі ўжо не Імперскія

PolotskSU



абстрактна-гераічныя войны, калі баі ўяўляліся нечым далёкім, з налётам мужнасці і рамантыкі. Наадварот, калі ў мінулым салдаты пагібалі на полі боя, а жыхары краіны назіралі за гэтым і чакалі дома, цяпер жа ўпершыню грамадзянскім прышлося жыць і змагацца як салдатам, а салдатам наадварот чакаць нібы грамадзянскім. Цяпер вайна закранула кожнага. [6, с. 5] Гэта былі новыя ўмовы жыцця, якія змянілі мяжу паміж домам і лініяй фронту, і паклалі адбітак на творчасць пісьменнікаў, якія выпрабоўвалі вострае пачуццё неяснасці і неразумення, што рабіць далей і ў якім напрамку працаваць.

Пад уплывам літаратуры Першай сусветнай вайны, для пісьменнікаў 40-х гадоў адзіным абгрунтаваным спосабам выразы сваіх думак стала антываенная літаратура са сваімі нацыянальнымі асаблівасцямі. Калі кіраўніцтва краіны ізноў, як і трыдцаць гадоў таму, пачало гучна распавядаць аб велічы і моцы Брытаніі, каб абудзіць глыбокія патрыятычныя пачуцці, то англійскія пісьменнікі, калі і не прынялі вайну, як само сабой разумеецца, але быццам не заўважылі ўсю сур'ёзнасць моманту. Грамадская свядомасць у гады Другой сусветнай вайны складвалася на аснове вопыту набытага ў гады папярэдняй вайны, таму новыя пафасна-патрыятычныя заклікі замест ахвярнага энтузіязму 1914 года выклікалі скептыцызм і сталі мішэнню сатырыкаў [7, с. 468].

Пры гэтым, важны ўплыў аказала традыцыйнай англійская замкнёнасць, бо ў выніку спецыфічнага геаграфічнага становішча «тое, што адбываецца па другі бок Ла-Манша, успрымаецца англічанамі як нешта, што адбываецца па другі бок культуры і цывілізацыі» [8, с. 18]. Як вынік, некаторыя англійскія пісьменнікі занялі нейтральную пазіцыю, прымаючы вайну, як проста новую з'яву жыцця.

Самыя першыя творы, прысвечаныя ваеннай тэматыцы: Герберта Уэлса «Неабходна бяспека» («Can't Be Too Careful», 1941) ці Сомерсэта Моэма «Гадзіна да золка» («The Hour before Dawn», 1941) былі напісаны з характэрнай для гэтай нацыі фанабэрыяй – славутай якасцю англічаніна, які «ўпэўнены, што ў яго краіне ўсё ідзе лепей, чым ў другіх» [9, с. 104]. Гэты недахоп падкрэслівае С. Моэм, які аб'ектам свайго сатырычна-скептычнага твора выбраў не столькі вайну, колькі характэрную для яе пачатковага перыяду маштабную прапаганду сацыяльнага адзінства нацыі. Пісьменнік не без іроніі малюе маладога брытанскага афіцэра Роджэра Хендэрсана, для якога вайна яшчэ ўяўляецца рамантычным спаборніцтвам джэнтэльменаў. Гэта быў ідэалізіраваны вобраз афіцэра, які потым будзе горка парушаны рэаліямі вайны.

Традыцыйнасць – адна з галоўных каштоўнасцей англійскага нацыянальнага характару. Даследчык англійскага характару У. Шастакоў справядліва падкрэслівае агульнапрыняты стэрэатып, што «англічане верны традыцыям, і цяжка аддаюць перавагу навізне» [8, с. 20]. Адданасць традыцыям згуляла з англійскай ваеннай машынай дрэнны жарт падчас вайны, калі нежаданне пазбавіцца старых інстытутаў і прынцыпаў не дазволіла хутка распачаць поўнамаштабныя баявыя дзеянні супраць фашызму.

Сарказмам і іроніяй у дачыненні да англіскай традыцыйнасці і кансерватызму быў прасякнуты раман Іўліна Во «Не шкадуйце сцягоў» («Put Out more Flags», 1942). Замест гераічнага вобраза абаронцы краіны пісьменнік прапануе неадназначную фігуру Бэзіла Сіла, увесь гераізм якога зводзіцца да подлага махлярства, якое ён праварочвае на фоне агульнай разгубленасці і неарганізаванасці. «Не шкадуйце сцягоў» поўніцца жорсткай сатырай ў адрас арміі, абсурднасцю загадаў, што поўнасцю разыходзіліся з рэальнай сітуацыяй і традыцыйнай для англійскай арміі думкай, што сапраўдным героем можа быць толькі афіцэр і толькі з «благароднага роду».

Яшчэ больш негераічнай і смешнай паўстае вайна ў наступнай трылогіі І. Во «Меч гонару» («The Sword of Honour», 1952–1961), дзе аўтар у поўнай меры раскрывае свае адносіны да падзей Другой сусветнай вайны. Галоўны герой Гай Краўчбэк – тыповы прадстаўнік выхадцаў з арыстакратычных сямей Англіі, ён палае жаданнем стаць у строй разам з другімі афіцэрамі, уяўляючы вайну рыцарскім турнірам для джэнтэльменаў. Такія рысы як снабізм, кодэксы традыцый і празмернае пачуццё гонару заўсёды былі і ў нейкай меры застаюцца стэрэатыпамі тыповага англічаніна. Між тым глыбокая традыцыя «ідэальнага джэнтэльмена» і з'яўляецца аб'ектам сарказма І. Во. Трылогія ўздымае праблему гераізму на кантрасце паміж архаічнай рамантыкай вайны і прагматыкай грамадства новага часу.

Сам Гай Краучбэк дастаткова шчыры і разумны чалавек, але агульная атмасфера англійскай арміі вымушае яго трапіць у сеціва пратэкцыянізму, бязмэтнай ваеннай актыўнасці і снабізму. Г. Гарджет заўважае ў героях І. Во такія антыгераічныя рысы як слабасць характару і рэальны заняпад джэнтльменскага класа, які абсурдна чэрпае гераічныя ідэалы з рамантычнай дзіцячай літаратуры і гістарычных легенд [10, с. 17]. Як вынік І. Во бачыць несумяшчальнасць такой тэатральнай дабрачыннасці мінулага з сучаснымі ваеннымі абставінамі, таму яго героі знаходзяцца ў моцным канфлікце з адэкватным успрыманнем рэальнасці. Падобны канфлікт уласціў кожнаму англічаніну, як заўважае В. Шастакоў, «англійскі характар сложны і парадаксальны ... няма большага граху, чым рабіць тое, што не прынята – і ў той жа час англічане заўзятыя індывідуалісты» [8, с. 16].

З сур'ёзнай крытыкай унутранага становішча ў краіне выступаў Джон Бойнтан Прыстлі. Яго раманы «Зацямненне ў Грэтлі» («Black-out in Gretley», 1942) і «Дзённы свет у суботу» («Daylight on Saturday», 1943) расказвалі аб атмасферы ў англійскім грамадстве падчас бамбардзіровак краіны. Пісь-

PolotskSU



меннік звяртаецца да мужнасці і гераізму простых рабочых на англійскіх заводах, многія з якіх былі цывільнымі валанцёрамі. Для шматлікіх брытанцаў 40-х гадоў сапраўдным гераізмам магло лічыцца ўжо тое, што людзі добраахвотна пакідалі свой дом, змянялі кваліфікацыю, уладкоўваліся на працу на заводы, да якіх да вайны ўвогуле не мелі дачынення.

У героях Прыстлі праявіліся традыцыйныя для англійскай нацыі ўпартасць, глыбокі энтузіязм і самааданасць сваёй справе. Гэты таксама было абумоўлена геаграфіяй краіны, што справядліва заўважае Г. Гачаў: «англічанам уласціва адчуваць сабе на сваім востраве як на вялікім караблі ў адкрытым моры. Трэба ўмець усё рабіць сваімі рукамі, воля і энэргія вызначаюць, ці выжыве чалавек у такім плаванні» [11, с. 433]. Словамі місіс Холт, якая працавала на авіязаводзе, пісьменнік падкрэслія выключны гераізм тых, хто выконваў свой абавязак: *Ваенны час не лічыцца ‹...› Усе мы гатовы рабіць зараз дзеля абароны шмат таго, чаго мы бы не сталі рабіць у мірны час. Але так і мусіць адбывацца* [12, с. 136]. Прыстлі параўновае рабочых з салдатамі на фронце, падкрэсліваючы, што змаганне ішло не толькі на фронце, але і ў тылу.

Тыповая разгубленнасць першай паловы вайны праследжваецца ў творчасці Г. Грына, а менавіта яго рамане «Пайманыя» («Caught», 1943). Яго героі часта ўяўляюць сабе салдата, не проста як чалавека, а як вобраз мужнасці, якога яны ніколе не здолеюць дасягнуць [13, с. 172].

Сваіх грамадзянскіх герояў пісьменнік быццам надзяляе адсутнасцю гераічных якасцей, яны то занадта маладыя ці слабыя фізічна, каб звацца сапраўднымі героямі.

Увесь раман аказваецца прасякнуты ўспамінамі галоўных герояў рамана, камандзіра пажарнай каманды Артура Пая і яго дапаможніка Рычарда Роў, жыццё якіх праходзіць паміж мінулым і сучаснасцю. У свёй творчасці Г. Грын не надае вялікай увагі гераічнаму выкананню сваіх абавязкаў лонданскай пажарнай службай, як гэтага маглі чакаць чытачы таго часу, а наадварот, у «Пайманых» пісьменнік робіць акцэнт на эмацыянальным неспакоі галоўных герояў.

У. Ален называе гэты раман трагікамедыяй непаразумення: героі шмат размаўляюць – і ні да чаго не здольны прыйсці [14, с. 142]. Падобныя паводзіны таксама знаходзяць сваё тлумачэнне ў глыбіні нацянальнгага характару: англічанам не хапае здольнасці працаваць разам. Кустова справядліва кажа, што яны «ніколі не імкнуцца рабіць што-небудзь за кампанію», між тым «звяртае на сябе ўвагу і іх здольнасць дзейнічаць узгоднена ў цяжкіх абставінах без лішніх абмеркаванняў, папярэдніх дамоўленасцей і, звязаных з гэтым, эмоцый» [15, с. 117]. Антыгераічная канцоўка рамана, калі камандзір Пай сконвае жыццё самагубствам сімвалізуе неўпэўненасць людзей і раз’яднанасць грамадства на цяжкім гістарычным этапе.

Такое іранічна-скептычнае мастацкае асэнсаванне сітуацыі ў краіне было адлюстраваннем рэакцыі брытанскага грамадства на першапачатковым этапе вайны, калі была аб’яўлена вайна, а салдаты проста сядзелі па казармах, калі гучала паветраная трывога, але тыдзень за тыднем ніхто не прылятаў. Пры гэтым, варта заўважыць, што брытанцы, як нікая іншая нацыя, схільны да моцнай самаіроніі і сарказму. Іронія, па сцвярджэнні К. Фокс, «неад’ёмны атрыбут ... пастаянны, заданы, стандартны элемент штодзённых адносін» [16, с. 85]. Калі прыняць да ўвагі, што іронія і ёсць своеасаблівая «абарона індывідуальнасці ад уварвання грубага абсурднага свету» [17, с. 63], становіцца зразумелым, чаму іранічны настрой англічан знайшоў сваё адлюстраванне ў літаратурных творах.

Акадэмічны слоўнік тлумачыць гераізм як «адметныя паводзіны, дасягненні ці высакародныя якасці, праяўленыя ў крытычных абставінах ці гэта здольнасць рызыкаваць жыццём або здароўем дзеля высокіх мэтаў» (пераклад наш. – М.К.) [18, с. 93]. Але гэтая характарыстыка носіць трохі абмежаваны характар, бо праводзіць прамую сувязь гераічнага з нечым выдатным, маштабным, патрабуючым ад героя абавязковага максімальнага самаахвяравання. Між тым ў англійскай літаратуры праявіліся некаторыя іншыя грані гераічнага.

Д. Голубеў у сваім даследаванні «Лінгвакультурны канцэпт «гераізм» у рускай і англійскай моўных карцінах свету» прыходзіць да высновы, што ўяўленне гераічнага англічанамі значна адрозніваецца ад разумення гэтай канцэпцыі іншымі народамі. Адступленне перад ворагам ці трусасць, якая не можа ні ў якім разе ўспрымацца за гераічнае, для англійскай народнай свядомасці ўяўляецца як Праява здаровага сэнсу, дзякуючы якому баец захоўвае сваё жыццё і, як следства, застаецца ў страю і можа працягваць выконваць свае функцыі.... Іншымі словамі ў сітуацыях, якія пагражаюць гібеллю, англічане аддаюць перавагу не рызыкаваць дарэмна, а праяўляюць асцярожнасць, якая з'яўляецца складанай часткай мужнасці» [19, с. 13].

Сапраўды, практычна не магчыма знайсці англічаніна, што гатовы кінуцца ў бой з шашкай нагала. На першы план для англічаніна выходзіць не эмацыянальны надрыў, не сардэчны боль ці імгненны душэўны парыў, а вядомая канцэпцыя «stiff upper lip»*. У складанай сітуацыі герой не абавязкова мусіць адразу праявіць сябе і свае здольнасці. Галоўнае – захаваць халодную разважлівасць, цвярозую ацэнку сітуацыі і не пасаваць перад цяжкасцямі.

PolotskSU



Прыкладам такога распаўсюджанага вобраза быў герой раманаў Р. Грынвуда «Містэр Банцінг у дні міра» («Mr. Bunting at War», 1940) і «Містэр Банцінг у дні вайны» («Mr. Bunting at Peace», 1941), дзе мы бачым маленькага баязлівага чалавека са сваімі абмежаванымі інтарэсамі і псіхалогіяй, але толькі падчас вайны адчуўшага ў сабе нечаканую стойкасць і вытрымку, аб якіх ён нават і не думаў раней. Гэтыя вобразы нечаканага гераізму можна знайсці ў творчасці амаль што ўсіх пісьменнікаў так званага перыяду «London Blitz», бо ў цяжкіх літаратурных умовах адным з спосабаў прадстаўлення маштабу сусветных падзей было засяроджанне на іх уздзеянні на аднаго асобнага чалавека [20, с. 134].

У рамане Нэвіла Шута «Пацукалоў» («Pied Piper», 1942) рэалістычна і дакладна апісаны няпростыя падзеі, якія адбываюцца з адным немаладым мужным англічанінам па імені Джон Сідні Хоуард, які волею выпадку едзе ў Францыю ў трагічным чэрвені 1940 года. Яму давяраюць вывезці з акружэння маленькіх дзяцей. Пажылы мужчына робіць усё, каб вывезці дзяцей у Англію з акупаванай тэрыторыі. Фактычна, гэта кніга пра сур'ёзны гераічны абавязак неваеннага чалавека. Н. Шут бачыць гераічнае перш за ўсё ў глыбокім асэнсаванні свайго грамадзянскага абавязку і моцным жаданні быць карысным людзям. Для гэтага не абавязкова быць на перадавой у акопах, дастаткова як Сідні Хоўард пачаць вязаць цёплыя рэчы для арміі. Пісьменнік вымярае гераізм маленькімі подзвігамі кожнага чалавека, здольнасцю выйсці са складанай сітуацыі ў сур'ёзных абставінах.

Перыяд вайны і першае пасляваеннае дзесяцігоддзе быў сапраўды самым цяжкім, калі, для кожнага пісьменніка, вайна стала вайной за выжыванне. Цяжкі ваенны час не дазваляў ў поўнай меры раскрыць характар чалавека і матывы яго гераічных ці антыгераічных паводзін. Час патрабаваў маментальнай аддачы, і вынікам стала тое, што выкарыстоўвая шырокія мастацкія сродкі, англійская літаратура не здолела адлюстраваць глыбокае разуменне гераічнасці чалавека ў экстрэмальных абставінах. Але можна з упэўненасцю казаць, што спрадвечныя рысы англійскай натуры няспынна заставаліся нейкім агульным фактарам, які аказваў глыбокі ўплыў на агульны стыль жыцця нават ва ўмовах ваеннага часу. Таму унутраны свет героя 1940–50-х гадоў дазваляе вылучыць адметныя асаблівасці англійскага нацыянальнага характару і сфарміраваць аснову разумення гераічнага, з якой ў англійскай літаратуры ўжо ў канцы першага пасляваеннага дзесяцігоддзя пачалі высочвацца новыя тэндэнцыі.

*Брытанская канцэпцыя вытрымкі і упартасці, часта ў кантэксце віктарыянскай эпохі.

ЛІТАРАТУРА


1. York, R. Evelyn Waugh's Farewell to Heroism / R. York // Heroism and Passion in Literature / edited by Graham Gargett. − New York: Rodopi B.V., 2004. − P. 245–253.
2. Коршунова, Е.С. Английский национальный характер как культурный конструкт (на материале английской художественной литературы): автореф. дис. канд. филос. наук: 24.00.01 / Е.С. Коршунова, Омск, 2012. − 20 с.
3. Тычына, М. Змена квадры: Літ.-крытыч. артыкулы. / М. Тычына. − Мн.: Маст. літ., 1983. – 204 с.
4. Панков, В. Годы – десятилетия − эпохи / В. Панков // Народный героизм и литература: сб. − М.: Советский писатель, 1977. − 270 с.
5. Оруэлл, Дж. Лев и Единорог. Эссе, статьи, рецензии / Дж. Оруэлл. − М.: Московская школа политических исследований, 2003. − 480 с.
6. Miller, K. British literature of the Blitz: fighting the people's war / K. Miller. – London: Palgrave Macmillan, 2009. – 216 p.
7. Саруханян, А.П. Частные судьбы людей и история. (Английская литература о второй мировой войне) / А.П. Саруханян // Вторая мировая война в литературе зарубежных стран / П.А. Топер [и др.]. − Москва: Наука, 1985. – С. 466–495.
8. Шестаков, В.П. Английская литература и английский национальный характер / В.П. Шестаков. − СПб: Нестор История, 2010. − 312 с.
9. Сухарев, В.А. Психология народов и наций / В.А. Сухарев. – Донецк: Сталкер, 2006. − 400 с.
10. Gargett, G. Introduction / G. Gargett // Heroism and Passion in Literature / edited by Graham Gargett. − New York: Rodopi B.V., 2004. − P. 7–18.
11. Гачев, Г.Д. Национальные образы мира / Г.Д. Гачев. − М.: Прогресс-Культура, 1995. − 480 с.
12. Пристли, Дж.Б. Пристли Дневной свет в субботу / Дж.Б. Пристли. – Ленинград: ОГИЗ, 1945. − 285 с.
13. Miller, K. British literature of the Blitz: fighting the people's war / K. Miller. – London: Palgrave Macmillan, 2009. – 216 p.
14. Аллен, У. Традиция и мечта / У. Аллен. – М.: Прогресс, 1970. – 423 с.
15. Кустова, Л.С. Тайна национального характера / Л.С. Кустова. − М.: ИКАР, 2003. − 164 с.
16. Фокс, К. Наблюдая за англичанами / К. Фокс. – М.: РИПОЛ, 2011. − 512 с.

PolotskSU



17. Гребенникова, Н.С. Традиция пародийно-иронического воспроизведения в современной английской литературе / Н.С. Гребенникова // Пути освоения художественного опыта в зарубежной литературе / В.С. Этингова [и др.]. − Иркутск , 1987. − С. 63–76.
18. Героизм // Большой академический словарь русского языка: в 20 т. / Институт лингвистических исследований РАН; редкол.: К.С. Горбачевич [и др.]. – СПб.: Наука, 2006. − Т. 3. – 677 с.
19. Голубев, Д.А. Лингвокультурный концепт «героизм» в русской и английской языковых картинах мира: автореф. дис. канд. филол. наук: 10.02.19 / Д.А. Голубев. − Ярославль, 2008. – 20 с.
20. Stewart, V. Narratives of Memory: British writings of the 40s / V. Stewart. − London: Palgrave Macmillan, 2003. − 218 p.

## БОСНИЯ ГЛАЗАМИ ИВО АНДРИЧА: МОСТ ИЛИ СТЕНА РАЗДЕЛЕНИЯ

**А.В. Наумова**
*Белорусский государственный университет, Минск (Беларусь)*

Иво Андрич – югославский писатель, Нобелевский лауреат в области литературы. Особое внимание в своем творчестве он посвятил Боснии – одной из самых противоречивых на сегодняшний день стран в Европе. Специфика данной среды издавна приводила к обострению многочисленных проблем, вызванных этнической и конфессиональной неоднородностью, – когда части населения, имеющие общее этническое происхождение, исповедуют ислам, православие и католичество. Кроме того, такой конгломерат культур стал причиной формирования в Боснии специфической системы ценностей, которая привлекала и привлекает внимание многих ученых, философов, писателей. Культурное пограничье – своеобразная среда, и жизнь в ней имеет целый ряд особенностей. Их стоит непременно учитывать во избежание проблем в сферах политического, экономического и культурного взаимодействия как в рамках одного государства, так и при построении стратегий международных отношений.

Будучи выходцем как раз из боснийской среды, писатель в силу жизненных обстоятельств имел возможность посмотреть на нее извне и дать ей серьезную оценку. Иво Андрич излагает оригинальное видение этноконфессиональной специфики жизни в этой стране не только на страницах своих романов, эссе, рассказов, стихотворений в прозе, но и в докторской диссертации на тему «Развитие духовной жизни в Боснии под влиянием турецкого владычества», защищенной в 1924 году в г. Грац (Австрия). Исследователи творчества писателя подчеркивают важность диссертации для понимания его творчества в целом: по словам З. Константиновича, она «находится на первом месте в наследии И. Андрича, <…> так как благодаря ей становится возможной полноценная встреча с сознанием писателя и с Боснией как его главной темой» (Здесь и далее перевод наш. – *А.Н.*) [3, с. 274]. Здесь, как и в своих художественных произведениях, автор не ограничивается отображением некоторой цепи событий и созданием образов их участников, но также пытается осмыслить закономерности исторического развития мира в целом и Боснии в частности.

Мы постараемся охарактеризовать взгляды Андрича-ученого на прошлое боснийского края и его противоречивое историческое предназначение. Жизнь на пограничье – бремя или высокая миссия? Босния – мост между культурами или стена разделения цивилизаций? Конечно же, ставить вопрос так категорично нельзя, учитывая всю сложность и противоречивость подобных проблем. Однако постараемся, оглядываясь на эти ориентиры, расставить акценты, определяющие отношение писателя к истории его Родины в свете событий, связанных с турецкой оккупацией.

Иво Андрич изучает последствия культурного слома, произошедшего на территории Боснии в результате ее завоевания турками. Он восстанавливает картину религиозной жизни в этих краях до прихода турок. Можно ли в дотурецком периоде истории Боснии обнаружить предпосылки формирования современного поликультурного комплекса? Дело в том, что боснийский край был многоконфессиональным уже в то время. Католики, православные и богомилы сосуществовали на территории Боснии.

Особый интерес для нас представляет история богомильской церкви. Богомильство И. Андрич называет именно народной религией, в отличие от католичества и православия, которые своими центрами признавали иноземные столицы и, таким образом, в большей или меньшей степени содействовали влияниям извне. И. Андрич такую природу богомильства трактует глобально и видит непосредственную ее связь с общей спецификой цивилизационного развития этого края: «...богомильство начало между Боснией и западным миром строить скалистую стену, которую ислам впоследствии еще более укрепит и возведет до такой высоты, что и сегодня еще, хоть и давно разрушенная, она продолжает действовать как мрачная линия разделения, которую невозможно перейти без усилий и опасности» [1, с. 39]. Получается, что предпосылкой установления именно такой системы цивилизационных координат, которую мы имеем на сегодняшний день, является положение дел в Боснии еще до завоевания. Корни таких позднее сфор-